# МІНСК І МІНЧАНЕ:

## ДЗЕСЯЦЬ СТАГОДДЗЯЎ ГІСТОРЫІ

да 955-годдзя горада









НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

# МІНСК І МІНЧАНЕ:

## ДЗЕСЯЦЬ СТАГОДДЗЯЎ ГІСТОРЫІ

да 955-годдзя горада

Зборнік навуковых артыкулаў

Мінск
«Беларуская навука»
2023

pawet.net

УДК 94(476-25)(082)
ББК 63.3(4Беи)я43
М62

Укладальнік

Р. А. Аляхновіч

Рэдакцыйная калегія:

В. Л. Лакіза (галоўны рэдактар), Р. А. Аляхновіч, В. Ф. Голубеў, А. Б. Доўнар,
А. А. Мяцельскі, Н. Ю. Перавалава, П. А. Трубчык

Рэцэнзенты:

кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. А. Скеп'ян
кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. У. Галубовіч

*Зборнік падрыхтаваны ў межах выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2021–2025 гг. «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» (навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік НАН Беларусі А. А. Каваленя) падпраграмы «Гісторыя» (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук дацэнт В. Л. Лакіза).*

*Зборнік рэкамендаваны да друку Вучоным саветам Інстытута гісторыі НАН Беларусі.*

М62 **Мінск і мінчане:** дзесяць стагоддзяў гісторыі : да 955-годдзя горада : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад. Р. А. Аляхновіч ; рэдкал.: В. Л. Лакіза [і інш]. – Мінск : Беларуская навука, 2023. – 545 с. : іл.

ISBN 978-985-08-3045-6.

У зборнік уключаны артыкулы, якія прайшлі апрабацыю на Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 955-годдзя горада)» 9–10 верасня 2022 г.

Тэматыка навуковых артыкулаў ахоплівае самы шырокі спектр праблем гісторыі горада ад старажытнасці да сучаснасці.

Адрасуецца вучоным, студэнтам, настаўнікам, краязнаўцам і ўсім тым, хто зацікаўлены ў вывучэнні гісторыі Беларусі.

**УДК 94(476-25)(082)**
**ББК 63.3(4Беи)я43**

**ISBN 978-985-08-3045-6**

© Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2023
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2023

# СПІС СКАРАЧЭННЯЎ

## АРХІВЫ, БІБЛІЯТЭКІ

БГАНТД – Белорусский государственный архив научно-технической документации

БДАМЛМ – Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва

ГАМО – Государственный архив Минской области

ГБЛ – Государственная библиотека и Библиографический институт БССР им. В. И. Ленина

ДАМВ – Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці

ЗДАМал – Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна

ИР НБУ – Институт рукописи Национальной библиотеки Украины

НАРБ – Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, Национальный архив Республики Беларусь

НББ – Национальная библиотека Беларуси

НГАБ – Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі

НИАБ – Национальный исторический архив Беларуси

РГАДА – Российский государственный архив древних актов

РГВИА – Российский государственный военно-исторический архив

РГИА – Российский государственный исторический архив

РДГА – Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў

ФАНД – Фонд археалагічнай навуковай дакументацыі

ЦГАОР СССР – Центральный государственный архив Октябрьской революции, высших органов государственной власти и органов государственного управления СССР, сейчас Государственный архив Российской Федерации

ЦНА НАН Беларусі – Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі

AGAD – Archiwum Główne Akt Dawnych

AR – Archiwum Radziwiłłów

LCVA – Lietuvos centrinis valstybės archyvas

LVIA – Lietuvos Vastybes Istorijos Archyvas (Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы = Государственный исторический архив Литвы)

## ПУБЛІКАЦЫІ КРЫНІЦ

АВАК – Акты, издаваемые Виленской Комиссией для разбора древних актов: в 39 т. Вильна, 1865–1915

БА – Беларускі архіў = Weissrussischer Archiv / склад. З. Даўгяла. Менск, 1930. Т. 3. Вып. 1. Менскія акты (XV–XVIII стст.)

БЭФ – Белоруссия в эпоху феодализма: сборник документов и материалов: в 4 т. Минск, 1959–1979

Мінск на старадаўніх картах і планах – Мінск на старадаўніх картах і планах (Minsk on the old maps and plans) / прадмова: І. А. Андрэеў; спец. змест і тэкст: І. А. Андрэеў, В. В. Андрэева, П. С. Растоўцаў. Мінск, 2021

ПКМГ – Памятная книжка Минской губернии

ПСРЛ – Полное собрание русских летописей

СЗ БССР – Собрание законов и распоряжений Рабоче-крестьянского правительства Белорусской Советской Социалистической Республики; Собрание законов, указов Президиума Верховного Совета Белорусской ССР, постановлений и распоряжений Совета Министров Белорусской ССР

СУ РСФСР – Собрание Узаконений и Распоряжений Рабочего и Крестьянского Правительства РСФСР

уласнае вучылішча з граматычнымі класамі, дзе і вучылася мясцовая моладзь з розных хрысціянскіх канфесій ажно да 1773 г.[1]

У цэлым жа, падводзячы агульную выснову аналізу ўніяцка-праваслаўнага супрацьстаяння ў Мінску у канцы XVI – першай палове XVII ст. у адукацыйнай сферы неабходна адзначыць тое, што дадзеныя канфесіі лічылі менавіта як важным атрыбутам уласнай ідэнтычнасці. Абарона моладзі ад іншавернага ўплыву, прывіццё ёй адпаведнага духоўнага выхавання, а таксама жаданне праз якасную адукацыю вернікаў умацаваць аўтарытэт сваёй царквы з'яўляліся вызначальнымі прычынамі, якія абумовілі пераўтварэнне тагачасных навучальных устаноў у месца вострага рэлігійнага супрацьстаяння. Яно, безумоўна, аслабляла абодва бакі, перашкаджала ім як след разгарнуць асветніцкую працу, прыдбаць новыя фундушы. А гэта рабіла іх вельмі адчувальнымі ад змен у палітычным ды сацыяльна-эканамічным жыцці краіны, вынікам чаго і стала манапалізацыя школьнай справы ў Мінску езуітамі.

*А. І. Дзярновіч (Мінск, Беларусь)*

# ЗАГАДКА КАФЛІ: ЦІ МАГЛІ ВАНЬКОВІЧЫ Ў XVII ст. ЖЫЦЬ НА МЕСЦЫ «ДОМА ВАНЬКОВІЧАЎ»?

## Гарадская сядзіба Ваньковічаў

Мінская гарадская сядзіба, вядомая як «Дом Ваньковічаў», займае важнае месца ў архітэктурным ансамблі Верхняга горада (іл. 1). У культурным жыцці Мінска сярэдзіны XIX ст. гэтая сядзіба таксама выконвала адметную ролю, стаўшы своеасаблівым літаратурна-музычным салонам. І гэты асяродак быў звязаны не толькі з родам Ваньковічаў, але таксама з такімі яркімі і важнымі імёнамі для культуры нашага краю, як Ян Дамель, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Чэслаў і Станіслаў Манюшкі, Уладзіслаў Сыракомля.

У 1912 г. мінская фальклярыстка і пісьменніца Зоф'я Кавалеўская апублікавала апрацаваныя ёю ўспаміны выкладчыка Мінскай гімназіі Фердынанда Шаблоўскага. Ва ўспамінах адзначалася такая спецыфічная рыса тагачаснай гарадской культуры, як існаванне малых сядзібаў («дробных двароў»), дзе жыццё адбывалася «як на вёсцы»[2]. У Мінску ж першай паловы XIX ст. славу артыстычных салонаў мелі «аўторкі» Горватаў і «чацвяргі» Багдашэўскіх. Ужо да сярэдзіны XIX ст. сядзіба Ваньковічаў на Валоцкай засталася адзінай, якая выконвала ролю такога гарадскога салона[3].

---

[1] *Самусік А.Ф.* Адукацыйная дзейнасць езуітаў у Беларусі ў другой палове XVII ст. // Гіст.-археал. зб. 2020. Вып. 35. С. 29.

[2] *Kowalewska Z.* Obrazki Mińskie 1850–1863. Wilno, 1912. S. 29; *Яна ж.* Мінскія абразкі 1850–1863. Мінск, 2021. С. 37 (у беларускім перакладзе недакладна перадаецца «drobny dworek» як «дробны дворык»).

[3] *Kowalewska Z.* Obrazki Mińskie 1850–1863. S. 30; *Кавалеўская З.* Мінскія абразкі 1850–1863. С. 39.



pawet.net



Іл. 1. Сучасны выгляд Дома Ваньковіча ў Верхнім горадзе Мінска. 2023 г.

Вакол Дома Ваньковічаў узніклі і характэрныя культурныя міфы, якія замацоўваюць гэты архітэктурны комплекс у мастацкім і інтэлектуальным жыцці горада. Даволі ўстойлівым застаецца ўяўленне, што ў гэтай сядзібе гасцяваў Валенці Ванькові́ч[1]. Сядзіба сапраўды належала стрыечнаму брату Валенція Вільгельма Ваньковіча (1792–1842) Эдварду Ваньковічу, але набыў ён яе ўжо пасля смерці Валенція ў эміграцыі ў Парыжы, куды той выехаў у ліпені 1839 г. Цяпер жа вядома, што сядзіба Валенція Ваньковіча знаходзілася ў Малой, ці Паезуіцкай, Сляпянцы (у той час па-за межамі Мінска); сядзіба ж Эдварда была ў маёнтку Сляпянка Радзівілаўская[2]. У другой палове XIX ст. гэтыя маёнткі атрымалі назвы адпаведна Малая Сляпянка і Вялікая Сляпянка[3].

Наведваючы ў 1846 г. маёнтак Ваньковічаў, Чэслаў Манюшка, бацька кампазітара Станіслава Манюшкі, занатаваў на адным са сваіх малюнкаў, на якім была выяўлена якраз Малая Сляпянка, наступныя настальгічныя радкі[4]:

---

[1] Гісторыя Мінска / пад рэд. У. А. Бабкова. Мінск, 2006. С. 267; *Корбут В., Ласько Д.* Мінск. Спадчына старога гораду. Мінск, 2016. С. 190.

[2] *Карповіч Т. А.* Культурнае жыццё Мінска І паловы XIX ст. Мінск, 2007. С. 48; *Дзянісаў У.* Сляпянскія сядзібы Ваньковічаў // Знакамітыя мінчане XIX–XX стст. Мінск, 2010. С. 33; *Сацукевіч І.* Тапаграфія і тапаніміка мясцін Мінска, звязаных з жыццём Валенція Ваньковіча // Знакамітыя мінчане XIX–XX стст. Мінск, 2010. С. 44.

[3] *Дзянісаў У.* Сляпянскія сядзібы Ваньковічаў. С. 31.

[4] Тамсама. С. 29; *Корбут В.* Мінск Станіслава Манюшкі // Беларус. думка. 2019. № 4. С. 69.

Dom poety czy malarza
Często w życiu to się zdaża
Nikt go nie zna gdzie się rodził
Gdyby grzębił ludzi zwodził
Jesli zamek on postawi
Każdy baśnie o nim prawi
Walentego nawiedziałem
Na pamiątkę nakreslilem
Nikt go nie znał iak ja tyle
Gdzie przepędzał gorzkie chwile.

Ślapianka Wańkowiczów, bliższa od Mińska

Сядзіба ж на вуліцы Валоцкай (сёння – вул. Інтэрнацыянальная, 33А) была купленая Эдвардам 3 красавіка 1846 г. у нашчадкаў папярэдняй уладальніцы Пелагеі Чарняевай за 2050 руб. срэбрам. У купчай было ўказана, што Э. Ваньковіч набыў дом па вул Валоцкай № 222 «с принадлежащими к оному строениями, как-то деревянным флигелем на каменном фундаменте, прачечною, конющнею и сараями, оранжерееою, холодным строением, фруктовым садом и огородом, каменною оградою с мебелью и всем движимым имуществом по инвентарю»[1].

Эвалюцыю забудовы сядзібы на працягу канца XVIII – пачатку XIX ст. можна прасачыць з дапамогаю планаў Мінска, якія рэгулярна пачалі з'яўляцца менавіта з канца XVIII ст. На першым «Плане губернскаго города Минска. Сочиненъ августѣ 1793го года»[2], падрыхтаваным падпаручнікам Міхаілам Дувэ, даволі дакладна пазначаная трасіроўка вуліц, гарадскія ўмацаванні, культавыя збудаванні і мураваныя пабудовы[3]. Але сядзіба на Валоцкай, размешчаная ў зоне рэгуляванай забудовы, ніяк не пазначаная. Падобная сітуацыя назіраецца і ў «Плане губернскаго города Минска»[4], створаным каля 1795 г.[5] На гэтым плане быў пазначаны рэльеф мясцовасці, але раён скрыжавання вуліц Валоцкай і Зыбіцкай выяўлены вельмі ўмоўна.

Упершыню абрысы сядзібы з'яўляюцца на «Плане Губернскаго города Минска съ новыми улицами и пристройками по расположенію мѣста»[6], які ацэньваецца як праектны[7], выкананы губернскім архітэктарам Фёдарам (Тэадорам) Крамерам. План быў зацверджаны 5 жніўня 1797 г., і на ім выразна выяўленая

[1] НГАБ. Ф. 146. Воп. 1. Спр. 361. Арк. 19–21; Ваньковичи / сост. Н. А. Голубева [и др.]. Минск, 2012. С. 361.

[2] РГВИА. Ф. 846. Оп. 16. («Военно-ученый архив»). Д. 22147; Мінск на старых картах і планах. С. 66–67.

[3] *Бегун Р. А.* Планы Минска кон. XVIII – первой трети XIX в. как источники по социальной топографии города // Genesis: исторические исследования. 2020. № 3. С. 42.

[4] РГВИА. Ф. 846. Оп. 16. («Военно-ученый архив»). Д. 21 563. Арк. 3; Мінск на старых картах і планах. С. 68–69.

[5] *Готин А. А.* Градостроительное развитие города Минска: 1793–1798 гг. // Республиканская строительная газета. 2010. 12 нояб. № 42. С. 18–20.

[6] РГИА. Ф. 485. Оп. 1. Д. 225. Л. 1; Мінск на старых картах і планах. С. 72–73.

[7] *Бегун Р. А.* Планы Минска конца XVIII – первой трети XIX в. С. 43.

структура сядзібы з галоўным домам і дзвюма афіцынамі. Мяркуецца, што на план былі нанесеныя запланаваныя да ўзвядзення будынкі на тэрыторыі сядзібы. Магчыма, сам Крамер быў аўтарам запраектаваных будынкаў[1].

На фіксацыйным плане Мінска, складзеным у тым жа 1797 г., сядзіба на Валоцкай пазначана як збудаваная. Гэты ваенна-кватэрамейскі «Планъ Минску в коемъ Смоленской дивизіи Ростовской мушкетерской полкъ расположенъ въ непремѣнныхъ квартирах, оныя здѣсь означены цыфрою 3ма, снятый 1797 года»[2], выкананы ў колеры. Паводле контурнасці нанесеных будынкаў, можна зрабіць высновы, што на плане такім чынам пазначаліся драўляныя пабудовы. Адпаведна, у 1797 г. сядзіба на Валоцкай у вядомай нам кампазіцыйнасці ўжо існуе.

Падрабязна структура сядзібы была выяўленая на плане пляца 1801 г. (іл. 2)[3]. Галоўны сядзібны будынак і афіцына з боку вул. Зыбіцкай пазначаны на плане карычневым колерам, то бок гэта былі драўляныя будынкі. Іншыя дзве пабудовы на тэрыторыі сядзібы пазначаны чырвоным колерам як мураваныя аб'екты.

Закончаны выгляд сядзібы маецца як мураванай забудовы на «Плане губернскаго города Минска»[4] ад 2 кастрычніка 1809 г. На пазнейшых планах Мінска 1817, 1834 і 1850-х гг. усе сядзібныя будынкі таксама пазначаныя як мураваныя. На такое ўспрыняцце магло паўплываць тое, што гэтыя будынкі былі ўжо патынкаванымі[5].



Іл. 2. План сядзібы па вул. Валоцкай. 1801 г. (НГАБ. Ф. 24. Воп. 1. Спр. 265. Арк. 19–21)

---

[1] Ваньковичи. С. 359.

[2] РГВИА. Ф. 846. Оп. 16. Оп. 1. Д. 22148; Мінск на старых картах і планах. С. 70–71.

[3] НГАБ. Ф. 24. Воп. 1. Спр. 265. Арк. 19–21.

[4] РГИА. Ф. 1293. Оп. 168. Д. 6. Л. 1; Мінск на старых картах і планах. С. 84–85.

[5] Ваньковичи. С. 359.

Дзякуючы росшукам беларускага архівіста Уладзіміра Дзянісава ўдалося выявіць найбольш раннія прыгадкі гарадской сядзібы на рагу вуліц Валоцкай і Зыбіцкай у канцы XVIII – пачатку XIX ст. як рэзідэнцыі князёў Друцкіх-Любецкіх[1]. Сядзіба на вул. Валоцкай знаходзілася ва ўладанні князёў Друцкіх-Любецкіх да 11 верасня 1811 г., калі яна (дом з плянам і афіцынаю) была прададзеная літаратару і ўплывоваму масону, старшыні Галоўнага цывільнага суда Яну Ходзьку[2]. 26 чэрвеня 1812 г. Ян Ходзька-Барэйка прывітаў каля Ракаўскай заставы Мінска маршала Французскай імперыі Даву, 12 снежня 1812 г. дачакаўся амністыі расійскага імператара Аляксандра I для жыхароў заходніх губерній, у 1816 г. заснаваў у Мінску масонскую ложу «Паўночная паходня» і ў 1818 г. дасягнуў рангу майстра катэдры[3]. «Паўночная паходня» з колькасцю ўдзельнікаў 231 на працягу 1816–1822 гг. была самай буйной ложай на тэрыторыі Беларусі[4] (да забароны масонскіх лож і тайных арганізацый 1 жніўня 1822 г.) (іл. 3).



Іл. 3. Скарбонка мінскай масонскай ложы «Паўночная паходня». Каля 1816 г. (Метал, серабрэнне, гравіроўка. 16 × 9 × 7 см. Muzeum Narodowe w Warszawie. № 208747 MNW)

На дадзеным этапе адсутнічае інфармацыя аб тым, што набыццё і функцыянаванне сядзібы нейкім чынам было звязанае з планамі Яна Ходзькі пашыраць масонства на даўняй Літве ці, наадварот, згортваць гэту дзейнасць. Але, паводле купчай ад 9 сакавіка 1818 г., уладальнік прадае сваю сядзібу вышэй ужо прыгаданай Пелагеі Чарняевай за 1000 чырвоных галандскіх залатых, што ў суме складала 2775 рублёў[5]. Менавіта да гэтага перыяду належыць акварэль з выяваю сядзібы, выкананая Юзафам Пешкам і вядомая пад назваю «Валокі Полацкія» (іл. 4)[6]. Малюнак добра перадае воблік класістычнай сядзібы з аднапавярховым галоўным будынкам і афіцыны з эркерам. У тым жа 1818 г. Ян Ходзька, масон сёмай ступені, змяншае свой удзел у дзейнасці ложы «Паўночная паходня» і пераходзіць на пазіцыю ганаровага сябра ложы[7].

Ваньковічы, пачынаючы ад Эдварда, сталі ў 1846 г. чарговымі ўладальнікамі сядзібы на Валоцкай, надалей трымалі гэты пляц у сваім валоданні да пачатку 1920-х гг., калі сядзіба была нацыяналізаваная савецкімі ўладамі (іл. 5, 6).

---

[1] Ваньковичи. С. 359.

[2] НГАБ. Ф. 588. Воп. 1. Спр. 211. Арк. 130.

[3] *Швед В. В.* Масоны і ложы на землях Беларусі (канец XVIII – першая чвэрць XIX ст.): біябібліяграф. слоўн. Гродна, 2007. С. 54.

[4] *Швед В. В.* Масоны і ложы на землях Беларусі. С. 28.

[5] НГАБ. Ф. 588. Воп. 1. Спр. 277. Арк. 15.

[6] *Карповіч Т. А.* Культурнае жыццё Мінска I паловы XIX ст. С. 8.

[7] *Швед В. В.* Масоны і ложы на землях Беларусі. С. 54.


Іл. 4. Юзаф Пешка. Від вуліцы Валоцкай. Пачатак XIX ст. Акварэль (Відділ мистецтв, Львівська національна наукова бібліотека України імені В. Стефаника)


Іл. 5. Сядзіба Ваньковічаў. 1916 г. Фота з калекцыі Станіслава барона Дангеля (Tygodnik Illustrowany. 1918, Nr. 21–22, maj – czerwiec. S. 247)



Іл. 6. Дом Ваньковічаў («Будынак пачатку XIX ст. па Акцябрскай (б. Хрышчэнскай) вуліцы»). 1928. Паводле: Шчакаціхін М. Помнікі старадаўняе архітэктуры XVII–XVIII сталецьцяў у Менску // Запіскі аддз. гуманіт. навук. Менск, 1928. Працы камісіі гісторыі мастацтва. Т. 1, кн. 6. С. 1–38. (ілюстрацыйная ўклейка паміж с. 32–33)

У Мінску другой паловы XIX – пачатку XX ст. сядзіба была вядомая пад устойлівай назваю «Дом Ваньковіча», ці «Сядзіба Ваньковіча».

Але маюцца яшчэ дадатковыя звесткі, якія ўдакладняюць імёны магчымых уладальнікаў сядзібы. Гаворка ідзе пра «Plan miasta Mińska z drugiej połowy XVIII wieku»[1], складзены ў «1920–1930 гг.» Аўтарам плана быў інжынер Тадэвуш Корзун (Tadeusz Korzón), малюнак 15.05.1934 выканаў тэхнік Б. Пясьляк (B. Pieślak). З'яўленне гэтага плана мае сваю перадгісторыю. У 1918 г. у Мінску адбылася «Абласная выстава старажытнасцяў і прыгожых вырабаў», на якой выстаўляўся «План города Минска. По старым планам и известиям обработан инж. Ф. Корзоном. Даёт представление об Минске до 1790 г.»[2]. Вельмі верагодна, што напрацоўкі плана 1918 г. склалі аснову для плана 1934 г.[3]

[1] План вядомы ў двух маштабах: Biblioteka Narodowa (Warszawa). Magazyn Kartografii. Sygn. ZZK 9 429 : Plan miasta Mińska: z drugiej połowy XVIII w. : podziałka 1:3 200 / plan opracował według źródeł archiwalnych inż. Tadeusz Korzon ; rysunek wykonał B. Pieślak technik. 1934 | Miejsce nieznane; Sign. ZZK 9 430 : podziałka 1:4 200. 1936.

[2] Каталог Минской областной выставки древностей и изящных изделий / сост. А. Иппель. Минск, 1918. С. 5; Przewodnik po mińskiej wystawie krajowej starozytności i przemysłu artystycznego Wystawa 10-tej armij / oprac. A. Ippel. Mińsk, 1918. S. 5.

[3] Мінск на старых картах і планах. С. 63.

Тут патрэбныя пару рэмарак пра асобу інжынера Тадэвуша Корзуна, якога ні ў якім разе не варта атаясамляць з вядомым гісторыкам, ураджэнцам Мінска, Тадэвушам Корзанам (Tadeusz Korzon; 1839–1918). Вельмі верагодна, што інжынер Корзун мае сваяцкія адносіны з гісторыкам Корзанам, але пакуль гэта генеалагічна не даследавана. Афіцыйна гісторык Тадэвуш Корзан паходзіў з «унцер-афіцэрскіх дзяцей», то бок не належаў да шляхецкага стану. Інжынер Тадэвуш Корзун быў дырэктарам Мінскай электрастанцыі ў 1905–1906 і 1911–1920 гг., а таксама лаўнікам і старшынёй Тэхнічнай секцыі Мінскага магістрата 1919–1920 гг.[1] Адносна напісання і вымаўлення прозвішча інжынера таксама могуць узнікнуць пытанні – у машынапісных пратаколах магістрата фігуруе форма «Korzon»[2], але ў пішучых машынках адсутнічалі магчымасці пазначэння польскай дыякрытыкі[3]. Але «Plan miasta Mińska z drugiej połowy XVIII wieku» мае выразнае пазначэнне аўтара як Tadeusz Korzón.

Гэты план дорыць нам яшчэ адныя звесткі пра магчымых уладальнікаў сядзібы на Валоцкай, якая пазначана як «Dworek Tyzenhauzena». Пакуль што не ўяўляецца магчымым вызначыць, на якое кола крыніц абапіраўся аўтар плана. Вядома, што Тадэвуш Корзун уваходзіў у склад Управы Мінскага Кола. Гэтая арганізацыя займалася інвентарызацыяй прадметаў, якія былі эвакуаваныя ці згубленыя на чыгунцы; падрыхтоўкай спісаў каштоўных матэрыялаў; арганізацыяй акцый вывазу культурных каштоўнасцяў і архіваліяў з абшараў Міншчыны і прылеглых тэрыторыяў у Варшаву; зборам матэрыялаў і захаваннем іх на спецыяльных складах[4]. У лістападзе 1918 г., пасля адыходу з Мінска нямецкіх войскаў, Кола арганізавала «3 транспарты» да Варшавы. Вывезеныя прадметы былі размешчаныя там у спецыяльных складах. Агулам Мінскаму Колу ўдалося вывесці 255 скрыняў (9 вагонаў) матэрыялаў[5]. Фактычным працягам дзейнасці Мінскага Кола стала праца Змешанай камісіі да спраў рэвіндыкацыі і рээвакуацыі польскай маёмасці, утворанай у выніку падпісання 18.03.1921 Рыжскай дамовы[6]. Мінскія каштоўнасці пры згодзе савецкай улады метадычна працягвалі вывозіцца ў Варшаву. У Варшаве

[1] Мінскі магістрат і гарадская рада ў дакументах (1919–1920 гг.) / падр. А. Г. Дашкевіч, А. А. Скеп'ян. Мінск, 2020. С. 13, 31, 347.

[2] Напрыклад: Мінскі магістрат і гарадская рада ў дакументах. С. 87.

[3] Мінскі магістрат і гарадская рада ў дакументах. С. 11.

[4] Гл. падрабязней: *Дзярновіч А. І.* План «Новага места» Мінска 1804 г.: новая іканаграфічная крыніца са збораў Мінскага кола Варшаўскага таварыства апекі над помнікамі мінуўшчыны // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 940-годдзя горада): матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 7–9 верас. 2007 г. Мінск, 2008. С. 185–186.

[5] AGAD. Zespół 202. Zbiór materiałów Mińskiego Koła Warszawskiego Towarzystwa Opieki nad Zabytkami z lat 1804–1908. Inwientarz (oprac. Dorota Lewandowska). S. 1.

[6] Гэтыя пытанні падрабязней асветлены: *Sochaniewicz K.* Sprawa rewindykacji archiwów i mienia kulturalnego Polski od Rosji // Wschód Polski. 1921, Nr. 8–9. S. 361–383; *Szwankowski E.* Archiwum Miejskie w Warszawie // Straty bibliotek i archiwów warszawskich w zakresie rękopiśmiennych źródeł historycznych. Warszawa : PWN, 1956. T. 2 : Archiwa porozbiorowe i najnowsze / red. K. Konarski. S. 357–414.

з 1920-х гг. вывезеныя каштоўнасці захоўваліся ў зборах Нацыянальнага музея. У 1950–1951 гг. архіўная частка гэтых матэрыялаў, інвентарызаваных у Нацыянальным музеі пад датамі 1495–1922 гг., была перададзеная ў Галоўны архіў старажытных актаў (AGAD), дзе і захоўваецца ў нашыя дні. Пэўна, сярод гэтых россыпаў дакументаў і могуць захоўвацца матэрыялы, на базе якіх Тадэвуш Корзун стварыў свой план-рэканструкцыю на працягу 1920 – пачатку 1930-х гг.

На дадзеным жа этапе мы можам спасылацца толькі на аўтарытэт інжынера і краязнаўца Корзуна і выказаць меркаванне, што да набыцця князямі Друцкімі-Любецкімі і грунтоўнай рэканструкцыі гарадской сядзібы, гэты пляц належаў Тызенгаўзенам.

Апроч іншага, пад 1765 г. мы маем згадку пра «пляц вяльможных паноў Ваньковічаў», які знаходзіўся «па левым баку вуліцы Валоцкай... [паміж] дваром вяльможнага пана Свентаржыцкага, пісара земскага, і домам яснавяльможнага пана Тышкевіча»[1]. Такім чынам, знаходжанне зямельнай маёмасці на вул. Валоцкай у сярэдзіне XVIII ст. фіксуецца дакументальна.

## Архітэктурна-археалагічныя даследаванні тэрыторыі сядзібы

Пасля перыяду функцыянавання ў рэжыме камунальных кватэраў сядзіба ў 1947 г. была абвешчаная помнікам архітэктуры рэспубліканскай значнасці. Пры тым што як сам сядзібны дом, так іншыя пабудовы комплексу панеслі значныя страты: падчас рамонтаў зніклі многія архітэктурныя дэталі на фасадзе і ў інтэр'ерах; разабраны васьмікалонны порцік; зменена планіровачная структура; паступова разбураныя цагляная агароджа і брама з боку Валоцкай (вул. Інтэрнацыянальнай); у 1975 г. была разбураная афіцына (паўночназаходні флігель).

Але ў канцы 1970-х гг. распачаліся даследчыя праектныя работы дзеля падрыхтоўкі праекта рэстаўрацыі помніка (аўтарамі праекта сталі архітэктары І. Дорахава і Я. Кандратаў), а ў 1980 г. было прынятае рашэнне пра музеефікацыю ўсяго комплексу[2].

Менавіта з гэтым этапам рэстаўрацыі звязаны і пачатак археалагічнага вывучэння пабудоваў і тэрыторыі сядзібы. У 1980 г. пад кіраўніцтвам Валянціна Собаля былі праведзеныя першыя археалагічныя раскопкі на тэрыторыі сядзібы, якія выявілі пласт канца XVI – XVII ст., насычаны фрагментамі арнаментаванай кафлі гэтага перыяду, пераважна зялёнапаліванай[3].

---

[1] Архіў Цэнтра па рэгенерацыі гісторыка-культурных ландшафтаў і тэрыторый. Аб'ект № 176/79. Інв. 6. Арк. 1. (Гістарычная даведка Р. Баравога); Ваньковичи. С. 354.

[2] Ваньковичи. С. 367; Музей «Дом Ваньковічаў». Культура і мастацтва першай паловы XIX ст. / уклад. С. А. Яцэвіч, Н. В. Сычова. Мінск, 2018. С. 4.

[3] *Соболь В.* Археологический отчет о полевых исследованиях, проведённых объединённой экспедицией СНРПМ и отдела археологии Института истории АН БССР в Минске в мае-июне 1980 г. Памятник архитектуры XIX в. – бывший дом художника Ваньковича в г. Минске. // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. № 749. Кн. І. С. 17; № 749 а. Кн. ІІ. Табліцы № 38, 62, 68, 69, 110, 111.

У час археалагічных даследаванняў 1983 г. быў выяўлены важны архітэктурна-археалагічны аб'ект. Ігар Чарняўскі, які разам з Валянцінам Собалем праводзіў даследаванні ў той час, зрабіў высновы, што засяленне тэрыторыі, на якой у далейшым размясцілася сядзіба на Валоцкай, адносіцца да пачатку XVII ст.[1] Асобныя знаходкі могуць датавацца і другой паловай XVI ст., але інтэнсіўнае засваенне тэрыторыі датуецца менавіта XVII ст. У другой палове XVII – пачатку XVIII ст. тут былі ўзведзеныя цагляныя пабудовы. І ў наш час пад паўночна-ўсходняй часткаю будынка (ахоплівае чвэрць плошчы) знаходзяцца амаль цалкам захаваныя сутарэнні XVII ст.[2] (іл. 7) (цэгла памерамі 30 × 14–17 × 8 см). У траншэі ўнутры будынка і ў шурфе 4 выяўленыя рэшткі сценак, складзеных з такой жа цэглы, што і падвал.

Значную па колькасці катэгорыю знаходак складаюць фрагменты кафлі XVII ст., якія маюць пераважна раслінную і геаметрычную арнаментацыю[3]. Падобныя матэрыялы былі выяўленыя і пазней, падчас даследаванняў Аляксандра Краўцэвіча ў 1990 г.[4] Але падчас археалагічных даследаванняў афіцыны



Іл. 7. Археалагічныя раскопкі сутарэнняў XVII ст. пад паўночна-ўсходняй часткаю Дома Ванькові́ча. 1983 г. Фотаздымак Ігара Чарняўскага

---

[1] *Соболь В., [Чернявский И.].* Отчет об археологических исследованиях в Татарском предместье [и Дома Ваньковича] г. Минска в 1983 г. // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. № 860 (Дом Ваньковіча). С. 25–26.

[2] Тамсама. С. 18, 20.

[3] Тамсама. С. 80, мал. 56, 57.

[4] *Краўцэвіч А. К.* Археалагічная справаздача аб раскопках на тэрыторыі помніка архітэктуры кан. XVIII – пач. XIX ст. дома № 35 па вул. Інтэрнацыянальнай у г. Мінску (Дом Ваньковіча) у сакавіку – красавіку 1990 г. // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. № 1222. Арк. 6, Фота 17.



Іл. 8. Фрагменты геральдычнай кафлі другой паловы XVII ст. Археалагічныя даследаванні тэрыторыі Дома Ваньковіча (1985, 1988 гг.). Прамалёўка



Іл. 9. Фрагмент геральдычнай кафлі другой паловы XVII ст. Археалагічныя даследаванні тэрыторыі Дому Ваньковіча (1985 г.). (Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. Філіял «Дом Ваньковічаў». № НВФ001273/2)

(флігеля) і тэрыторыі сядзібы, якія праводзіў у 1988 г. аўтар гэтага артыкула, а таксама ў працэсе рэстаўрацыйных прац, былі выяўленыя фрагменты геральдычнай кафлі, якія прыўносяць новыя старонкі ў гісторыю сядзібы.

Падчас раскопак 1988 г. быў знойдзены фрагмент зялёнапаліванай кафлі з выявай літары М і нанесенай над ёй крыжыкам[1] (іл. 8 : *3*). Але падчас рэстаўрацыйных прац як пад'ёмны матэрыял былі выяўленыя цэнтральныя элементы пласціны гербавай кафлі[2], гэтым разам непаліваны (іл. 9 : *2*; 8 : *2*). Таксама былі знойдзеныя іншыя фрагменты такой кафлі, як непаліваныя, так і паліваныя, што дазваляе больш поўна ўявіць гербавую выяву (іл. 10). Выяўленыя разам з геральдычнай фрагменты кафлі геаметрычна-расліннай арна-



Іл. 10. Фрагменты геральдычнай кафлі другой паловы XVII ст. Археалагічныя даследаванні тэрыторыі Дома Ваньковіча (1980-я гг.). (Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. Філіял «Дом Ваньковічаў». № НВФ001273/2, № НВФ001273/1)

---

[1] *Дзярновіч А. І.* Справаздача аб архітэктурна-археалагічных даследаваннях у верасні-кастрычніку 1988 г. // Архіў ААТ «Белрэстаўрацыя». Аб'ект 176-1-89. Інв. № 6. Кн. І. Ар. 11. Іл. 3; Кн. ІІ. С. 25. Ф. 21-3.

[2] *Дзярновіч А. І.* Справаздача аб архітэктурна-археалагічных даследаваннях у верасні – кастрычніку 1988 г. Кн. І. С. 17–18; *Дзярновіч А. І., Чарняўскі І. М.* Мінская сядзіба Ваньковічаў // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. / рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. Мінск, 1993. С. 432.



Іл. 11. Фрагменты кафлі другой паловы XVII ст. з геаметрычна-раслінным арнаментам. Археалагічныя даследаванні тэрыторыі Дома Ваньковіча (1988 г.)



Іл. 12. Гербавая кафля
Уладзіслава Ваньковіча,
войскага ваяводства Менскага. 1680-я гг.
Рэканструкцыя Андрэя Шулаева

ментацыі (іл. 11) маюць аналагі ці блізкія тыпы з Мінска, Лідскага і Мірскага замкаў, якія датуюцца XVII ст.[1] Апроч таго, варта ўлічваць, што выяўленыя пад сядзібным домам цагляныя сутарэнні былі прадатаваныя другой паловай XVII ст.

Такім чынам, на кафлі, знойдзенай на тэрыторыі сядзібы па былой вул. Валоцкай, можна ўбачыць наступныя геральдычныя сімвалы: у цэнтры знаходзіцца двойчы перакрыжаваная страла, ахвосце стралы раздвоена; пад стралой знаходзіцца раўнаканцовы крыжык; вакол стралы размешчаныя ініцыялы W W W W M. Кляйнодам, які вянчае поле герба, выступае княская мітра (карона), увянчаная скарочаным лапчатым крыжом (іл. 12).

[1] Беларуская кафля / аўт. і ўклад. В. Е. Собаль, М. А. Ткачоў, А. А. Трусаў, У. В. Угрыновіч. Мінск, 1989. С. 54–56.

## Персаналія ўладальніка сядзібы ў XVII ст.

Паводле сваіх тыпалагічных асаблівасцяў і стратыграфічных характарыстык, выяўленыя фрагменты кафлі могуць датавацца другой паловай XVII ст. Герб на кафлі інтэрпрэтуецца як «Ліс» (з адменай). Асаблівасцю яго з'яўляецца наяўнасць княскай мітры, а таксама раўнаканцовага крыжыка пад перакрыжаванай стралой. Дакладнага падабенства з іншымі варыянтамі гербу «Ліс» не выяўлена, але княская мітра ўжывалася на гербах двух родаў, якія карысталіся гербам «Ліс» – князі Свірскія і шляхецкі род Ванькавічаў[1].

Супастаўляючы ўсе гэтыя звесткі, можна прапанаваць наступную інтэрпрэтацыю абрэвіятуры W | W | W | W | M: Władysław Wańkowicz Wojski Województwa Mińskiego. Род Ванькавічаў сапраўды быў моцна павязаны з земскімі ўрадамі Менскага ваяводства. Традыцыйна, яшчэ ў канцы XVI – першай палове XVII ст. яны займалі ўрад войскіх – як Стэфан Юр'евіч Ваньковіч (Ванькевіч) (1576–1581), Адам Стэфанавіч Ваньковіч (1626–1636)[2], Пётр Адамавіч (памёр да 1560)[3].

У абавязкі войскага ўваходзіла забеспячэнне функцыянавання павета ў час войнаў, у тым ліку апекі над жонкамі і дзецьмі шляхты, якая знаходзілася ў ваенным паходзе. III Статут ВКЛ 1588 г. (раздз. III, арт. 6) вызначыў іерархію земскіх урадаў, паводле якой войскі займаў сярэдняе становішча паміж падсудкам і стольнікам[4]. Сістэма іерархіі ВКЛ была змадыфікаваная ў 1677 г. і атрымала новае афармленне разам з кароннай у 1768 г.[5], калі літоўскі войскі заняў у іерархіі 7-е месца – зноў жа паміж суддзёй земскім і стольнікам (па-за ваяводам і кашталянам налічваліся 23 урады)[6].

Можна меркаваць, што пасля сканчэння эпохі паспалітага рушання як эфектыўнага інструменту ваеннай мабілізацыі, то бок ужо ў канцы XVI ст., урад войскага набыў рысы тытулярнай пасады. Іерархія пераўтваралася ў чыста ганаровую і не азначала ўзаемнага падпарадкавання ўрадам, якія знаходзіліся фармальна вышэй. Мяркуецца, што кіраванне адміністрацыяй сканцэнтравалася пад уладаю старосты гродавага, які таксама не выпраўляўся ў ваенныя паходы[7]. Але апякунства шляхецкімі сем'ямі не трапіла ў спіс абавязкаў старосты[8].

---

[1] *Chrząński S. T.* Tablice odmian herbowych. Warszawa, 1909. Tabl. VI, IV rząd, X kolumna.

[2] *Радаман А., Вілімас Д., Галубовіч В.* Земскія ўраднікі Менскага ваяводства ў другой палове XVI – першай палове XVII ст. // Commentarii polocenses historici = Полацкія гістарычныя запіскі. Полацак, 2006. Т. III. С. 67.

[3] Ваньковичи. С. 18.

[4] Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мінск, 1989. С. 116.

[5] *Goralski Z.* Urzędy i godności w dawnej Polsce. Warszawa, 1983. S. 185.

[6] Ibid. S. 187.

[7] Ibid. S. 203.

[8] *Wejnart A.* O starostwach w Polsce do końca XVIII wieku z dołączeniem wykazu ich miejscowości. Warszawa, 1877. S. 49–57.

Уладзіслаў Ваньковіч быў авансаваны на ўрад войскага Менскага ў 1680 г.[1], прыгадваецца на гэтым урадзе ў 1688 г.[2], да гэтага ў 1667–1677 г. ён быў чашнікам вількамірскім[3]. Уладзіслаў тройчы абіраўся дэпутатам Галоўнага Трыбунала ВКЛ – у 1681 (як войскі менскі), 1687 (як войскі менскі), 1692 гг. (як суддзя земскі менскі)[4]. У 1687 г. ён з'яўляўся дэпутатам ад Вількамірскага павета.

Сярод ураднікаў земскіх судоў Менскага ваяводства адсутнічала практыка адначасовага ўжывання ганаровых тытулаў. Уладзіслаў Ваньковіч на пачатак 90-х гг. XVII ст. заставаўся войскім і быў суддзёй земскім менскім. Аднак, выконваючы абавязкі суддзі земскага, ён не згадваў тытул войскага. Войскім менскім Уладзіслаў Ваньковіч менаваўся толькі ў справах, якія не мелі дачынення да выканання ім судовых функцый[5].

У генеалагічных даведніках існуе разыходжанне ў тым меркаванні, хто мог быць бацькам Уладзіслава – Пётр ці Адам? Паводле пакаленнага роспісу, прапанаванага Дзянісам Лісейчыкавым, бацькам з'яўляўся таксама войскі менскі Пётр Адамавіч[6]. Стваральнікі спісу ўраднікаў Віленскага ваяводства пазначылі Уладзіслава паводле імя па бацьку як Адамавіча[7]. Выглядае ўсё ж, што версія пра імя войскага як Уладзіслаў Пятровіч больш абгрунтаваная: Адам Стэфанавіч быў якраз дзедам Уладзіслава Пятровіча і пайшоў з жыцця яшчэ ў 1636 г.

Але ў другой палове XVII ст. вядомы Уладзіслаў Ваньковіч піўнічы вількамірскі, які фігуруе на гэтым урадзе ў 1687 г.[8] Уладзіслаў (Пятровіч) Ваньковіч падчас знаходжання на гэтым менскім урадзе не прыгадваецца, хоць урад чашніка вількамірскага ён у свой час трымаў. Магчыма, у крыніцах адбылося накладанне пасадаў, бо ў 1687 г. Уладзіслаў Ваньковіч, войскі менскі, становіцца дэпутатам Галоўнага Трыбунала ВКЛ ад Вількамірскага павета.

Жонкаю Уладзіслава был Ганна Кімбар, дачка суддзі браслаўскага земскага суда[9]. Памёр бяздзетным пасля 1692 г.

---

[1] Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy / pod. ked. A. Rachuby. Warszawa, 2004. T. I. Województwo Wileńskie XIV–XVIII w. S. 410, № 3005.

[2] Гербоўнік беларускай шляхты / Дз. Ч. Матвейчык [і інш.]; навук. рэд. А. Рахуба. Мінск, 2014. С. 143; *Чарняўскі Ф. В.* Ураднікі (пасады, тытулы) Менскага ваяводства XVI–XVIII ст.: біяграф. даведн.: Мінск, 2021. Т. 3 : В. Вып. VI : 1 частка (падстарасты судовыя гарадскія, гродскія суддзі). С. 264.

[3] Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. T. I. Województwo Wileńskie XIV–XVIII w. S. 410, № 3005; *Чарняўскі Ф. В.* Ураднікі (пасады, тытулы) Менскага ваяводства XVI–XVIII ст. : біяграф. даведн. Баранавічы, 2007. Вып. I. С. 185.

[4] Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1582–1696). Spis / pod red. A. Rachuby. Warszawa, 2007. S. 345, 366, 386.

[5] *Чарняўскі Ф. В.* Ураднікі (пасады, тытулы) Менскага ваяводства XVI–XVIII ст.: біяграф. давед. Мінск, 2010. Вып. III : (канюшыя, абозныя, краўчыя, мастаўнічыя і будаўнічыя). С. 172.

[6] Ваньковичи. С. 18; Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 3. С. 143.

[7] Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. T. I. S. 410, № 3005.

[8] Ibid. S. 449, № 3365.

[9] Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 3. С. 143.

Што тычыцца княскай мітры ў якасці кляйнода герба, тот тут варта звярнуцца да родавага падання Ваньковічаў, паводле якога яны паходзілі ад літоўска-рускіх князёў, а менавіта ад князя Баляслава-Балькона Ваньковіча, які нібыта ўзгадваецца ў 1350 г. як сын полацкага князя Вацлава па мянушцы Ванька, і дачкі князя Кейстута[1]. Ваньковічы сапраўды першапачаткова змяшчалі княскую мітру на сваіх гербах. Ваньковічы імкнуліся паслугоўвацца княскім тытулам і выкарыстоўваць адпаведную сімволіку, пакуль ім гэта дазваляла права Рэчы Паспалітай. Соймавая канстытуцыя 1638 г. ураўнялі ўвесь шляхецкі стан у тытулатуры і спыніла функцыянаванне княскіх тытулаў у гродскіх і земскіх канцылярыях, апроч унесеных у акт уніі[2]. Соймавай канстытуцыяй 1641 г. гэты прынцып быў пацверджаны[3]. Лічыцца, што пасля гэтых прававых актаў Ваньковічы спынілі практыку паслугоўвання княскім тытулам[4]. Аднак выпадак з гербавай кафляй Уладзіслава Ваньковіча сведчыць, што і ў другой палове XVII ст. Ваньковічы яшчэ выкарыстоўвалі ў гербе княскую мітру.

## Высновы

Аналіз комплексу пісьмовых, картаграфічных, іканаграфічных і археалагічных крыніц дазваляе сцвярджаць, што пляц па гістарычнай вуліцы Валоцкай (цяпер Інтэрнацыянальная) у Мінску, дзе знаходзіцца гарадскі сядзібны комплекс, вядомы пад назвай «Дом Ваньковічаў», яшчэ да набыцця сядзібы ў 1846 г. Эдвардам Ваньковічам належаў у папярэднія перыяды роду Ваньковічаў. Археалагічныя і пісьмовыя крыніцы паказваюць, што, прынамсі, у другой палове XVII ст. гэты пляц знаходзіўся ва ўладанні Ваньковічаў і належаў персанальна войскаму менскаму Уладзіславу Ваньковічу († пасля 1692). Адпраўным пунктам для ідэнтыфікацыі імя ўладальніка пляца ў другой палове XVII ст. стала выяўленне падчас археалагічных даследаванняў на тэрыторыі сядзібы фрагментаў кафлі з гербам «Ліс» (з адменай) і з манаграмай W | W | W | W | M: Władysław Wańkowicz Wojski Województwa Mińskiego. Цалкам верагодна, што будынак канца XVII ст. з мураванымі сутарэннямі быў збудаваны якраз за часамі валодання сядзібы Уладзіславам Ваньковічам.

Пасля Уладзіслава Ваньковіча можна наступным чынам рэканструяваць храналагічны спіс уладальнікаў пляцу і сядзібы:

пасля 1765 г. – другая палова XVIII ст. (?): Тызенгаўзы;

канец XVIII ст. – 11.09.1811 г.: князі Друцкія-Любецкія (пачатак рэканструкцыі сядзібы ў 1797 г.);

11.09.1811 г. – 9.03.1818 г.: Ян Ходзька-Барэйша;

[1] Ваньковичи. С. 14; Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 3. С. 142.

[2] Volumina legum : prawa, konstytucie y przywileie Krolestwa Polskiego, Wielkiego Xięstwa Litewskiego y wszystkich prowincyi należących na walnych seymiech koronnych od seymu wiślickiego roku pańskiego 1347 aż do ostatniego seymu uchwalone : przedruk zbioru praw staraniem XX. Pijarow w Warszawie, od roku 1732 do roku 1782 wydanego. Petersburg, 1860. T. 3 : ab anno 1609 ad annum 1640. S. 441–442.

[3] Volumina legum. T. 4: ab anno 1641 ad annum 1668. Petersburg, 1859. S. 8–9.

[4] Ваньковичи. С. 16.

9.03.1818 г. – 2.04.1846 г.: Пелагея Чарняева і яе нашчадкі;

2.04.1846 г. – 1920 г. Эдвард Ванькові і яго нашчадкі.

Апроч таго, варта адзначыць, што валоданне сядзібай Янам Ходзькам-Барэйшам у перыяд пасля Напалеонаўскай вайны 1812 г. храналагічна супадае з яго праектам па пашырэнні масонства ў даўняй Літве і заснавання ў 1816 г. мінскай ложы «Паўночная паходня».

На падставе наяўных дакументальных, іканаграфічных і археалагічных крыніц можна вызначыць наступныя этапы будаўнічых прац на тэрыторыі сядзібы ў канцы XVIII – пачатку XIX ст.:

1) 1797 г. – пачатак рэканструкцыі сядзібы паводле новага плана (губернскага архітэктара Фёдара Крамера?);

2) да 1801 г. сядзіба ўжо мела планіровачную структуру, якая захавасцца надалей;

3) да 2.10.1809 г. усе будынкі на тэрыторыі сядзібы, уключна з галоўным, былі патынкаваныя і выяўляліся на планах як мураваныя.

Гарадская сядзіба «Дом Ваньковічаў» з'яўляецца адным з самых адметных архітэктурных аб'ектаў гістарычнага цэнтра Мінска (Верхняга горада) і непасрэдным чынам павязана на розных этапах з гісторыяй роду Ваньковічаў – мясцовай палітычнай і гаспадарчай элітай.

*Н. М. Палтаржыцкая (Мінск, Беларусь)*

# НАЗВЫ ВУЛІЦ І ВУЛАЧАК МЕНСКА Ў АКТАХ МАГІСТРАЦКІХ КНІГ 1663–1680 гг.

На працягу апошніх трох дзесяцігоддзяў працягваецца актыўнае вывучэнне ўрбанонімаў Менска (сучасны Мінск). На сённяшні дзень добра даследавана гарадская тапанімія сталіцы за перыяд з канца XVIII ст.[1] Аднак назвы вуліц за XVI–XVIII стст., гісторыя іх узнікнення і месцазнаходжанне вывучаны

[1] *Боровой Р. В.* Планирование и застройка левобережной части исторического центра Минска в XIX – начале XX в. (по материалам архивных источников) // Архіварыус. Мінск. 2012. Вып. 10. С. 132–146; *Сацукевіч І. І.* Тапаграфія і тапаніміка мінскага Замчышча і Траецкай Гары ў канцы XVIII–XX ст. // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі. Крыніцы па гісторыі горада. Сацыяльныя структуры і паўсядзённасць: (да 945-годдзя Мінска): зб. навук. арт. / уклад. А. І. Груша; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск, 2012. С. 215–220; *Сацукевіч І.* Назвы вуліц і плошчаў Мінска ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. // Беларус. гіст. часоп. 2021. № 2. С. 11–18.; *Ён жа.* Назвы вуліц і плошчаў Мінска ў другой палове XIX – пачатку XX ст. // Беларус. гіст. часоп.. 2022. № 3. С. 29–35; *Ён жа.* Назвы вуліц і плошчаў у міжваенны перыяд (1919–1940) // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 510-годдзя атрымання Менскам магдэбургскага права): матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 4–5 верасня 2009 г. / рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск, 2010. С. 176–181; *Ён жа.* Назвы вуліц Мінска ў 1945–1985 гг. // Молодежь в науке – 2009: прил. к журн. «Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» :. в 5 ч. Минск, 2010. Ч. 2. Серия гуманитарных наук / редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.), В. В. Гниломедов [и др.]. С. 32–35; *Ён жа.* Змены ў назвах мінскіх вуліц у 1986–2000 гг. // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Мінска : у 5 кн. Мінск, 2007. Кн. 5, ч. 2. С. 151–153.

## ЗМЕСТ

**Спіс скарачэнняў** ........................................................................................................ 3

**Прывітальнае слова Старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, акадэміка У. Р. Гусакова на адкрыцці канферэнцыі «Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 955-годдзя горада)», 9 верасня 2022 г.** ........................................ 5

**Прывітальнае слова дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі кандыдата гістарычных навук, дацэнта В. Л. Лакізы на адкрыцці Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 955-годдзя горада)», 9 верасня 2022 г.** ........................................ 7

**СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ МЕНСКАГА КНЯСТВА**

*Вайцяховіч А. В.* Гісторыя, інтэрпрэтацыя і перспектывы вывучэння археалагічнага комплексу на рацэ Менцы ........................................ 9
*Темушев С. Н.* Датирование и обстоятельства складывания Менской волости Полоцкой земли ........................................ 20
*Русаў П. А.* Ізноў пра бітву 1067 года на Нямізе ........................................ 33
*Русаў П. А.* Па слядах легендарнай Нямізы (Нямігі) ........................................ 38
*Трусаў А. А.* Архітэктурна-археалагічнае даследаванне Мінска ў ХХ ст. ........................................ 47

**МЕНСК – ЦЭНТР ВАЯВОДСТВА**

*Волкаў М. А.* Дарогі з Менска ў Вільню ў XIV–XVII стст. ........................................ 50
*Шулаеў А. Л.* Вексілалагічная спадчына Міншчыны ........................................ 61
*Казанцэў Я. Я.* Антрапагенныя мадыфікацыі ландшафту вусця ракі Пярэспы ў гістарычным развіцці XVI–XXI стст. ........................................ 70
*Самусік А. Ф.* Адукацыйны аспект уніяцка-праваслаўнага супрацьстаяння ў Мінску напрыканцы XVI – першай палове XVII ст. ........................................ 79
*Дзярновіч А. І.* Загадка кафлі: ці маглі Ваньковічы ў XVII ст. жыць на месцы «Дома Ваньковічаў»? ........................................ 85
*Палтаржыцкая Н. М.* Назвы вуліц і вулачак Менска ў актах магістрацкіх кніг 1663–1680 гг. ... 100
*Пашкевіч У. І.* Актавая кніга Мінскага магістрата 1702–1732 гг. як крыніца па сацыяльна-эканамічнай гісторыі горада ........................................ 110
*Доўнар А. Б.* Масты Мінска ў другой палове XVIII ст. ........................................ 121
*Сосонкина В. Ф.* Деятельность аптеки Минского иезуитского коллегиума (1749–1773) .... 127
*Атнагулов А. И.* Слобода Романово ........................................ 136

**ГУБЕРНСКІ МІНСК**

*Фельдман Д. З.* К истории еврейского предпринимательства в Минске и Минской губернии на рубеже XVIII–XIX вв. ........................................ 159
*Власенко А. Г.* Минск в войне 1812 г. ........................................ 166
*Филатова Е. Н.* Минск в воспоминаниях и дневниках середины XIX в. ........................................ 169
*Ерашэвіч А. У.* З гісторыі тэатра Мінска ў 40–50-я гг. XIX ст.: арганізацыйна-фінансавыя аспекты ........................................ 172

*Готин А. А.* Защита Минска от огня в первой половине XIX столетия ............ 184
*Анофранка Н. В.* Праблема падкідышаў у Мінску ў 30–50 гг. XIX ст. ............ 217
*Шимукович С. Ф.* Уроженцы Минска в рядах научной элиты Российской империи ........ 229
*Урублеўскі В. В.* Жыхары Мінска ў святле запісаў аб шлюбе метрычных кніг праваслаўных цэркваў за 1860–1865 гг. ............ 240
*Крэнць М. А.* Кантрыбуцыйныя зборы з домаўладальнікаў г. Мінска ў 1863–1896 гг. ....... 249
*Грибко И. Л.* Создание и деятельность Минской городской думы ............ 259
*Маркович Л. Г.* Разработка проекта устройства Минской конки (1886–1888) ............ 269
*Зеленков В. И.* Имя на карте города: Иван Зданович и Дмитрий Козырев ............ 275
*Сідаровіч В. С., Гаўрыленка Н. А.* Дэкаратыўныя расліны ў сядзібных дамах Мінска і Мінскай губерні (1890–1905) ............ 289
*Ершова О. И.* М. Я. Фрумкина – революционерка и организатор народного образования 294
*Сакольчык А. Э.* З гісторыі дзейнасці «Рыцараў зялёнага поля» ў Мінску: некаторыя аспекты гарадскога побыту канца XIX ст. ............ 304
*Рындин С. Н.* Иностранные военнопленные Первой мировой войны в г. Минске ............ 315

## МІНСК – СТАЛІЦА БССР

*Сильванович С. А.* Польские вооруженные формирования в Минске в 1917–1918 гг. ....... 320
*Латушкова Ю. П.* Неосуществленный проект выпуска бон города Минска 1918 г.: подготовка местной эмиссии или попытка создания национальной валюты? ............ 330
*Грузицкий Ю. Л.* Минская окружная контора Народного банка РСФСР (1919–1920) ........ 340
*Бамбешка І. І.* Асобы Мінскага абласнога музея: Усевалад Дзмітрыеў ............ 348
*Каплієў А. А.* Ахова здароўя насельніцтва Мінскай акругі Грамадзянскага ўпраўлення усходніх зямель ва ўмовах польскай акупацыі (1919–1920) ............ 350
*Соловьянов А. П.* Социально-экономическое положение населения Минска в начале 1920-х гг. ............ 361
*Пецюкевіч Т. У.* Развіццё прадпрыемстваў водазабеспячэння г. Мінска ў перыяд НЭПа .... 372
*Полетаева Н. И.* «Деловые люди» Минска в середине 1920-х гг. ............ 375
*Бароўская В. М.* Дзейнасць Беларускага таварыства садзейнічання ахвярам інтэрвенцыі ў Мінску (1924–1925) ............ 387
*Сацукевіч І. І.* Назвы прадмесцяў, слабод, урочышчаў, рабочых пасёлкаў, зялёных масіваў і раёнаў Мінска ў 1920–1930-я гг. ............ 394
*Елизаров С. А.* Советский Минск: образование и развитие системы районного деления...... 403
*Барановский А. Л.* Неизвестные страницы истории Национальной библиотеки Беларуси: сотрудники учреждения (1922–1941) ............ 411
*Зеленков В. И.* Незаслуженно забытые имена: Алексей Усов и Иосиф Майстер ............ 419
*Денисов А. В.* Минские адреса Алексантери Ахола-Вало. Финский художник в пространстве белорусской столицы в 1924–1930 гг. ............ 437
*Паўлава А. Я.* Матэрыялы выбітных мінчан, дзеячаў культуры Беларусі, у фондах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва ............ 450
*Тамковіч Ю. В.* «Асінстрой беларускай навукі»: універсітэцкія будоўлі 1920–1930-х гадоў ... 462
*Кошман В. И.* Археологические работы на территории охранной зоны историко-культурной ценности Республики Беларусь «Место захоронения военнопленных и мирных граждан – узников концентрационного лагеря "Дрозды"» в 2022 г.: основные результаты... 474
*Надтачаев В. Н.* Роль и место Главной полевой комендатуры 392 в организации карательных акций против партизан и мирного населения ............ 489
*Монзуль В. Ю.* Организация послевоенной жизни в общежитиях г. Минска по материалам Национального архива Республики Беларусь (июль 1944 – 1953) ............ 493

*Карпянкова М. Л.* Сталічна-рэпрэзентатыўныя матывы ў мастацкім вобразе пасляваеннай архітэктуры Мінска ........ 503
*Сімакоў А. В.* Мінчане ў кантактах з індзейцамі: сустрэчы, перапіска........ 509

## ТУРЫСТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ МІНСКА

*Казачкова Н. С.* Потенциал гастрономического туризма г. Минска ........ 520
*Жукова О. Н.* История в лицах (Из опыта работы ГУ «Музей истории города Минска»)...... 526
*Слесарава М. М., Зяноўка Я. С., Унучак А. У., Анофранка Н. В., Бакуновіч А. А., Латышэвіч Д. І., Тукай М. С., Максімаў У. У., Танюкевіч Д. П., Казлова М. А., Гецэвіч Ю. С.* Інтэрактыўныя гіды сталіцы Рэспублікі Беларусь........ 535